# ДЗЕНЬ СЛАВЯНСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**Дню славянскага пісьменства і культуры 24 мая 2019 года была прысвечана літаратурная сустрэча ў інтэрнаце Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.**

У мерапрыемстве прынялі ўдзел члены Саюза пісьменнікаў Беларусі: украінскі паэт з Гродна Рыгор ГАРМАШ і паэт, публіцыст Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК. Навучэнцы каледжа пачулі аўтарскія паэтычныя творы на трох славянскіх мовах і атрымалі запрашэнне да супрацоўніцтва з пісьменніцкай арганізацыяй.

Арганізатар мерапрыемства – педагог Ніна Паўлаўна Домань.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** падчас літаратурнага мерапрыемства ў студэнцкім інтэрнаце. 24 мая 2019 года.



[КРЫНІЦА]